СЯРГЕЙ ХМАРА

Літаратурная Суустань "Баявая Ускалось"

СКАЗЫ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Выданьне суполкі "Ускалось"
На чужыне : : : : : : 1949

СЯРГЕЙ ХМАРА

Літаратурная Сустань
"Баявая Ускалось"

СКАЗЫ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Выданьне супалкі "Ускалось"
На чужыне : : : : : 1949

Сяргей Хмара

СКАЗЫ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

З ь м е с т:

Услонім-гарадок 5
Бусел 11
Васілька 15
Арын 20
Запомненае слова 23
Купальле 26
Як на сьвеце паны паўсталі . . 29

УСЛОНІМ-ГАРАДОК

Сярод драмучых лясоў ракою сівой плылі дрыгавіцкія чайкі і дубы усьцяж далей і далей, глыбей і глыбей на захад.
На Услоньні ракі затрымалася дружына дрыгавіцкая.
Стаяў княжыч малады, дружыны ваяцкай правадыр, на беразе высокім.
Стаяў, пазіраў, хараством дзікім адкрытае краіны апіваўся.
Здалёк сінелі ў сівой імгле дрыгавіцкія лясы, а навакол разьляглося цудоўнае ўзгор'е, пакрытае зелянінай сачыстых хмызьнякоў.
Хваляваліся ў далінах між узгоркамі барханы травы сачыстай, бруілі серабрыстыя ручайкі, шапталі крыніцы на адхонах горак.
Запала ў сэрца княжычу маладому мясьціна прыгожая.
Руку ўзьняў, дружыну прыклікаючы.
Быць тут гораду нашаму.
І вырас па княжыча загаду, на высокім беразе ракі, рубанец княжачы з церамцом, а каля яго гасьцей тарговых крамы і харамы. І назвалі новы горад дрыгавіцкі Услонім-Гарадок. Бо на Услоне-адхіле ракі, між узгоркаў, пабудаваны, зьсечаны быў.
І рос новы горад дрыгавіцкі, з багацтва буяў, славу аб сабе далёка па ваколіцы і ў чужыя краі заносячы.
Бо сеў горад на шляху вялікім, у чу-

жыя краі выхаду.
Сюдою плылі тавары чужыя гоцкія, вараскія з мора бурштынавага, цераз Нёман-раку, што ў краіну "нёмых" людзей з моваю незразумелаю вяла.
А з другога боку цераз Днярпо і Прыпяць у дубох гасьцей тарговых царадзкае багацтва ехала.
У чужыя краі дрыгавіцкі мёд, воск, скуры зьвярыныя, кудзеля серабрыстая ішла.
І ўсё каля Услоніма-Гарадка. І ўсё па рацэ услонімскай, гарадзкой карміліцы.
Палюбілі сваю раку-карміцельку услонімцы дрыгвічы за яе ласкі багатыя рыбныя, за яе нораў рахманы, воды ціхія, ня бурлівыя, за яе шчырасьць да дзяцей сваіх дрыгавіцкіх.
І назвалі яе Шчара-рака. Шчарая-шчырая рака.

-:-:-:-:-:-

Багацтва гораду дрыгавіцкага на Шчары-рацэ зайздрасьць суседзкую выклікала.
Ня раз прабавала Яцьведзь лясная гордамі, як саранча з лясоў далёкіх выскакваючы, багацтвам гарадзкім пажывіцца, мячом дрыгавіцкім адбіваная.
Дакацілася слава Услоніму аж за Буг сіні, у мазурскую галодную зямлю, апэтыты галодныя распальваючы.
Але моцны быў горад. Харобрая была дружына услонімская.
Бяжалі недасекі без аглядкі з-пад гарадзкіх частаколаў-засекаў, у балотах далёкіх гінучы.

Тады ўзяліся ворагі на хітрыкі. Калі ня возьмеш маладосьць адвагаю, дык возьмеш маладосьць падманам, ашуканствам, у дрыгвічоў няведамым.
Ой, маладыі княжыч княжыў у горадзе
Прыслалі мазуры ў горад дрыгавіцкі пасольства вялікае з дарамі багатымі мір вечны з князем цалавалі, з дрыгвічамі раднікцца.
А ў сэрцы - зраду чорную прынесьлі.
На чале пасланцоў бажара найхітрэйшага, служку свайго Бога мазурскага паставілі.
Дарункі багатыя перад княжычам разлажылі, ягоных прыбочных абдарылі, а пасьля віна чырвонага гоцкага бочкі паднесьлі.
П"е княжыч з дружынаю і з гасьцямі зрадніцкімі дзень, п"е другі...
А пасланцы ім гутаркі хвальшывыя, да вуха лісьлівыя нашоптваюць, у сэрцы пыхі ненасыт разбуджваючы.
І ты, моў, княжыч, чалавек разумны і годзе табе над адныімі паганамі радзімічамі ўва Услоніме-Гарадку панаваць. Прымі ты нашу веру мазурскую праўдзівую, а нашу князёўну мазурску за жонку. І будзеш ты тады пан над намі, уладар над уладарамі над усёй мазурскай і дрыгавіцкай зямлёй.
А прыбочнікаў княжавых, дружыну маладзецкую падпітую, годнасьцямі магнацкімі ў мазурскай зямлі - зманьваюць.
Слухаюць п"яныя галовы, гутаркі хітрыя.
Слухае іх княжыч маладыі недасьведчаны.
З хмелю ад віна заморскага вачыма

мазурскімі на сьвет углядаецца, а вушамі мазурскімі словы слухаюць.
П"яным сьмехам за багаром мазурскім з Пяруна сівога сьмяюцца. Пачынаюць з Купалы сонцавокага зьдзекавацца.
Вартавыя пры засеках гарадзкіх, у браме рубенца княгацкага, на дзядзінцы княжацкім асьцяны з рук пакідалі,над конаукамі з віном сядзяць, за прыкладам галавароў аб будучай славе разважаюць...
А лясамі вакольнымі драмучымі паўзуць пад Услонім ватагі збройныя мазурскія - абозы вазоў пустых скрыпяць, на дабычу прыцьшыкаваньня.
Бавіцца церамец, дзядзінец княжацкі,з хмелю ачмураны...
З п"яна сагоў родных прадае, мазурскага славіць...
Не гарелі Купальскія агні ў гэтым годзе на ўзгорках навакол гораду у гэтую ноч. Зрадзілі Купалу услонікцы.
Стаяла адзінока ягоная "баба" у сьвятым гаі над крыніцамі, пакінутая,за помненая для мазурскай хвальбы; для варожых абяцанак зрадлівых.
І адвярнуў сонечны Купала свой твар ад нявёрных дзяцей сваіх.
Не завязаў ён вачей ватагам мазурскім разбойніцкім, каб у балоты непралазныя патрапілі і броду не знайшлі.
Трасцы-Цёткі свае каб у дрыготкі-мі хаманку ліхую узяла іх не паслаў.
Падкраліся ворагі пад самы горад, засекі не зартаваныя пералезьлі, п"яную варту пасеклі, на дзядзінец княжацкі ускочылі, агонь з усіх чатырох кутоў падкладаючы, прыбочных князёўскіх сякучы мячамі.

А госьці мазурскія, што за сталамі сядзелі, п"янымі прастаўляючыся, з-за пазухаў нажы хапілі, п"яных услонім цаў у грудзі жгаючы.
Ой, крывавы банкет распачаўся над Шчарай ракой.
Паплыла рака крывёю дрыгавіцкай, накармілася целам белым маладзецкім...

. . . .

Апрытомнеў ад хмелю княжыч малады, калі запалаў церанец ягоны і заблісьцалі мазурскія мячы над галовамі сяброў - дружыны ягонай вернай, хапіўся за меч свой - дружыну верную клічучы.
Але ляжала верная дружына, мазуром сьцятая, зрадаю, віном узятая.
Згінуў у агні Услонім-Гарадок...
Павярнулі выратаваўшыяся услонімцы на папялішчы, ахвяру Купале-апякуну гораду прынесьлі.
Услонім на новым месцы, недалёка ад навілі, дзецям із роду ў род апавядаючы аб мазурскай зрадзе і аб княжычу недасьветчаным з дружынаю запавет паміраючага княжыча паўтараючы: "Ня вер ніколі мазуру".
А на Купальскую ноч штогод, у самую поўнач, із старых папялішчаў Услонім Гарадка выскаквае на кані з мячом у руках коньнік малады, княжыч палёглы.
Тры разы навакол папялішчаў канём абскоча, дружыну сваю верную гукаючы.
Але сьпіць дружына дрыгавіцкая.
І гіне княжыч у крыніцах да другога Купальля.

Бо не паставіў яшчэ Бог кару ворагам..
Але ўстане адной Купальскай ночай на заклік княжыча верная дрыгавіцкая дружына.
Запалаюць над роднай зямлёй Купальскія агні.
І учыніцца помста дрыгавіцкая.
І уваскросьне слава нашай зямлі.

ж:ж:ж:ж

Б У С Е Л

/Народная легенда/

Стварыў Бог усё жывое на зямлі, зьвяроў, птахаў вялікіх і маленькіх, гадаў паўзучых.
А першага чалавека - паляшука стварыў.
Яшчэ зямля ня высахшы пасьля стварэньня была, як узяліся паляшукі за працу.
Выбралі сушэйшы куток між балотаў непраходных, хаткі курныя паставілі і давай рыбу і ўюноў навакол лавіць.
І добра жылося-б паляшуком, каб ня гэтае гадаўё рознае. Бо ня толькі ўюны ў вадзе буйна вадзіліся. Разьвялося па балотах і жабаў і вужоў.
Процьма. Кіне паляшук трыгубіцу на ліні ці ўюна, выцягне, а адтуль жабы, вужы галовы паказваюць, у хаты забіраюцца, у гаршкі ўлазяць, дзяцей жаляц
Стала неўмагату жыць паляшуком.
Сабраліся яны неяк і пастанавілі пасланцоў да самога Бога паслаць із жальбою на гадаўё балотнае.
А тады з Богам блізенька жылося - дарога ў вырай якраз недзе каля Кухоцкай волі ляжала - усе зналі.
Узялі пасланцы варэні лазовыя, бабы ім ікранікаў туды і камяку напакавалі каплуну на дарогу пасёрбалі і ў дарогу ў чаўны выправіліся.
Прыехалі гэта яны да самога выраю, у браму пастукалі і перад абліччам самога Бога станулі.

-Ратуй, Божа. бо ня выжывем, гадаў ё апанавала. У сеці выцягнеш - гад у каце пад печкаю, гад у карайвацях, гад у калыоцы дзіцячай і туды забярэцца - жыцьця няма.
І пашкадаваў Бог сваіх людзёў" -
-Добра, - кажа. - Ідзеце да хаты, усё зробіцца.
Павярнуліся палашукі да хаты і зноў да працы ўзяліся, на зьмілаваньне Боскае чакаючы.
А Бог сабе клюку ўзяўшы, на спацыр па балотах выбраўся. Бачыць: но але, зусім апанавала гадаўё старонку палашуцкую.
Засярдаваў Бог на агідзтва балотнае.
-Вы, - кажа, - гэтак. Маім людзям не даеце жыць.. А ну, лезьце ў мех.
Распасьцёр Бог мех, і палезла ў яго ўся нечысьць з палашуцкай зямлі, і жабы, і вужы, і рапухі лыпавокія.
Напакавалася яго ў мех - аж страх углядацца. Насілу матузком завязаць можна было.
Узваліў Бог мех на плечы і да выраю сабе цягне, але дзе-ж гэта бачана, каб такі цяжар хто мог далёка зацягнуць..
Прыцягнуў Бог гэты мех да вёскі, а тут ужо і пот цурком, і сярэдзіну ламаць стала - вядома-ж, стары.
Кінуў Ён яго на зямлю ды і кажа людзям:
-Схавайце, людзі, пакуль я анелаў з выраю ня прышлю - гэты мех, бо сам не данясу, зацяжкі. ды толькі не разьвязвайце яго мне.
Паставілі палашукі мех у куточку і на анелаў чакаюць. - А была ў вёсцы Сымоніха - баба дзыкаватая, а ужо праньыра. ня дай Божа. Яна табе

у кажны гаршчок суседу ўлезе, каб зірнуць, што на вячэру варыў, а чым сьнедаў, а што Язэп з рыбалкі прывёз, а скуль у Пятрусіхі андарак чырвоны... І усё ёй мала. І ўсьцяж яна зайздросная.
І рыбы ёй мала Сымон налавіў, у іншых болей, і манны ў яе сітца меньш натрусілася, і курыца ёй мала яечак нясе. Грызе, грызе Сымона, што той бедны на лучыну высах з жончыных гутарак.
Пабачыла вось Сымоніха мех, што Бог у вёсцы пакінуў, і зусім здурэла. Калі, кажа, нават Бог змогся нясучы, дык хіба-ж у ім багацтва нязьлічонае Вось мусіць, самое золата напакаванае. Вось, каб гэта нам яго крышку, вось зажылі-б шчасьліва. Удзень язык, як млыновае кола, без перапыну ходзіць ноч прыдзе - яшчэ папраўляецца -
-Памру. жыць ужо ў гэтакай бядоце не магу. І што гэта за мужык.. Жонка памірае, а ён і пальцам не кране. ня мужык, а зьвер.
Стагнаў, стагнаў Сымон. Да розуму конца прамаўляў:
-Ці ты з глузду зьехала. Як-жа мы можам Боскі наказ ламаць. Кары ты Божае не баішся..
А Сымоніха абнімае, блізка прытуліцца, як котка, ды шэпча:
-Сымонка, ды мы крышачку. Бог і не пазнае, матузком зноў завяжам, а мы зажывем. А калі не, дык чую, што памру я. Вось пабачыш - памру. Ты хочаш жончынай сьмерці га.. Зьвярына. Забіуца ты..
І зноў яго за рукаў да мяха цягне. Пацеў, пацеў Сымон, ды бачыць - рады няма - каго-ж жонка не ўламае. - узяў

ся ён за матузок ды давай мех разьвязваць. А жонка рашата ўжо на грошы трымае...
Адно-ж, як шугане з разьвязанага мяха розная нечысьць ды ў балоты - вужы, гадзюкі, жабы, рапухі.
Кінуўся Сымон з Сымоніхай з перапуду ўцякаць, а тут і Бог перад імі стаіць.
Разгневаўся Бог за людзкі ўчынак, які загад Боскі зламаў. І пастанавіў Бог пакараць Сымоніху і Сымона. Махнуў ён рукой, іператварыліся Сымон і Сымоніха ў чырвонадзюбых буслаў, якія за пакараньне маюць па балотах і лугох зноў выпушчанае гадаўё зьбіраць каб людзям ня шкодзіла, а каб не нагаварвала зноў Сымоніха Сымона да злых учынкаў, адняў Бог ад іх мову нават птушыную. Толькі і клякочуць буслы дзюбаю, як з перапалоху, Сымон і Сымоніха зубамі брашчалі, калі убачылі што нарабілі, загад Боскі парушаючы.

Пінск.

-§-§-§-§-§-§-§-

ВАСІЛЬКА

Заараным чорным полем, як сягнуць во кам, крывавымі плямамі павыраслалі чырвоныя матузы васількоў. Калышуц ца крывавыя матузы васількаў. Калы шуцца, шапочуць быль-казку. Страшную, жахліву... Аб часох праклятых, жудас ных.
Высока над палескімі балотамі шарее сваімі вежамі стоячы на ўзгорку Кар - туз Бярозаўскі кляштар. Сядзяць у кляш тары мніхі-чужынцы. Богу свайму мо- ляцца. Зарок маўкліваосьці выконваюць. А навакол кляштару - вёскі беларускія. На кляштарнай паншчыне пяць дзён у ты дзень працуюць. Палеткі кляшторныя аб рабляюць пад крык прыганятага мніша- га. Пад сьвістам аканомавага бізуна. Бо добра любяць мніхі і паесьці. А яшчэ больш любяць дарункі кляшторныя - ры зы золататканыя, ланцугі залатыя, крыжы з дыямэнтамі - мнішыя капі - тульныя верхаводы варшаўскія, кракаў скія. Навісла цяжкою марай над картуз- бярозаўскай наваколіцай сьцень белага, маўклівага мніха-чужынца. Навісла бе- лым жахам бязвыходнае роспачы...Сто гне беларуская вёска ў прыгонным мні шым ярме...
У кляшторным фальварку ткуць залаты- мі шаўкамі рызы дзяўчаты вясковыя. Цякае кроў з твару маладога. І вырас таюць пад тонкімі пальцамі блакітна-во кай Васількі - цудоўныя ўзоры зала - тыя - крозы дзявочыя, незабыўныя.

Стаіць дыжурны мніх-наглядач над ткальніц працай - белы, як здань. На рукі прыткія, рухлівыя, маладыя углядаецца. На узоры-озызы цудоўныя. На вочы блакітныя ткальлі маладое. І пачынае грызьці мнішае сэрца рабак. Перабіраюць рукі пацеркі - малітвы шэпчучы; удары сэрца заглушаючы. А вочы ад дзявочых рук, ад дзявочых вачэй блакітных, ад вуснаў палаючых адарвацца ня могуць.
А ўначы сьніцца маладому мніху вёска родная, бацька, баярын захудалы. На дзьве валокі зямлі - пяць сыноў. Бацькоўская судзьба ў судох каралеўскіх з кляштарам картузаўскім, магутным, які валокі прысвоіць хацеў у баярына захудалага. І забралі-б, адсудзілі-б апошнія валокі ў баярына, каб не здагадаўся, не ахвяраваў ён кляштару сына свайго наймалодшага на ратунак роду свайго старадаўняга. Акрылі сэрца юнацкае мнішае белым габітам-расаю, вочы палкія каптуром пакрылі. Пацерамі, начнымі калекнкаваньнямі, польмя ў маладых грудзёх ступылі. І стаў юнак Юрь мніхам, гаспадарку бацькоўскую для роду ратуючы.
Пацяклі гады... шэрыя, адзін да другога падобныя, як родныя браты. Келія - муры касьцёлу кляшторнага. Белыя, маўклівыя мнішыя сьцені ў каптурох, ды ў цішы касьцельнай пацерак чорных ляскат. Прайшоў навіцыянт - паслушменства. Затачэньне ў мурох кляшторных - пробу моцы абету-прырачэньня ласкавым вокам пачаў на яго пагдядаць стары прэор. Годны сваім паслушменствам і набожнасьцю стаў ордэну маўклівых картузынаў - "хам", баярыч захудалы. І вось пачалі вызначаць маладо

га мніха на дагляд кляштарных службаў на кіраваньне гаспадаркаю кляштораю. І дбаў толькі ён аб дабры кляштару. Глухі ён быў на скаргі і сьлёзы сялянскія аб непасільнай працы прыгоннай. Сьляпы ён быў на жудасы нідзеньня кляшторных прыгоньнікаў.

І вось збудзілі вочы блакітна вокай дзяўчыны сэрца пад картузынскім габітам. Дарма шэпчуць пацеры вусны. Вочы п"юць асалоду грэшную красы дзявочае, п"янеюць ад вобразаў шалёных... Цудоўныя майскія ночы сярод мадрынаў парку кляшторнага. Страшна і салодка маладым, кахаючым сэрцам. Хоць апранута адно з іх у мнішы белы габіт. Хоць прыгоннай кляшторнай ткальлі належыць другое. Але - чуткі кляшторны высак. Гостры кляшторны закон. Трэба аддаць усё зямное ўлажы ўпаму мнішы габіт. І быць толькі сьляпым выканаўцам волі ордэну. Слугою верным дбаючым яму багацьце. І ня могуць нікія людзкія болькі, людзкія пажадзьдзі грудзі мнішыя хваляваць. Камнем мусіць быць сэрца картузына. І гора таму, хто гэтаму не падпарадкуецца. У ордэне ня можа быць здрайцаў. Ходзяць за кажным сьцені падсочнікаў. Высачана ўжо бунтарная пара, што асьмелілася законы кляшторныя зламіць. Сядзяць у піўніцах, лёхах кляшторных, пад вежаю, віноўнікі. Засядае ў кляшторнай залі рада старэйшых. Бунт уварваўся ў брамы кляштару...

..."Хамская" кроў прыгоньнікаў гэтага краю адазвалася ў нашым былым сябры, даючы нам навуку на прышласьць".

Завеяла сваімі крыламі над заляю сьмерць.
Б"ецца над кляшторнымі скляпеньнямі хаўтурны касьцельны сьпеў. Расьце перагародка з цэглы, замуроўваючы нішу ў кляшторным муры, а ў нішы белы, як сьмерць, са зьдзёртым з галавы каптуром - Юры-мніх. Б"ецца над кляшторнымі скляпеньнямі хаўтурны сьпеў па жыўцом замураваным баярычу - прырачёньне мнішае зламаўшаму...
Дзьяблаўскую кару выдумала мнішая рада, ткальлі прыгоннай, якая асьмелілася на белы картузынскі габіт вочы ўзьняць. Да зуб"яў бараны прыказаў прывязаць ланцугамі Васільку. Пару коні стаельных у барану запрэгчы і па полі зораным пусьціць. Каб разьнясьлі яны цела дзявочае, бунтавацца пасьмелае. Панясьлі перапалоханыя такою нопаю коні. Анямелі з жаху сагнаныя з вёсак прыгонныя сяляне, заенчылі жанчыны. Акрапіла Васількіна непавінная кроў палі ваколічныя. А вясной зьйшлі на тых мясцох расьліны з лістамі чырвонымі, крывавымі. Нібы плямы крыві ткальлі нешчасьлівае. Аб злачынстве мніхаў-чужынцаў напамінаючыя І назваў народ беларускі гэтую расьліну: Васількаю - па імені ткальлі замардаванае.
Зыходзіць кажнай вясной у гародах сялянскіх Васілька, напамінаючы Беларусам часы чужацкага прыгону...
Пяшчотліва аполіць гаспадыня расьліну - успамін праліванай беларускай крыві і раскажа дзецям гісторыю аб Юрыммніху ў белым каптуры і прыгоннай

ткальлі Васільцы...
Зааранымі чорным полем, як сягнуць вокам, крывавымі плямамі павырастала Васілька - пралітая кроў беларускага народу.

Картуз-Бяроза.

А Р Ы Н
/народная легенда/

Гэта было даўно. Жыў на нашай зямлі недалёка Нёману Арын-земляроб. Зямлю гараў, жыта, пшаніцу сеяў, ды аб розных вялікіх рэчах меркаваў. А галоўнае - хацеў пазнаць Арын сусьвет. І захацелася Арыну паляцець, як птушцы лёгкакрылай, туды ўверх, да сонца, каб быць самому - роўнаму багом. Да вырая на дарозе завінуць, на вырайскія парадкі зірнуць.

Думаў, думаў Арын, выдумаў ён хітрык умелы.

Ня раз бачыў ён, як цягнуць вясной шляхам паднябесным жураўлі, паварачваючы з выраю, ня раз чуў ён, як яны вытрублівалі сваю песьню-малебен сонцу, лятучы ў вышыні з паваротам увосень.

І парашыў Арын на журавох да сонца паляцець.

Хадзілі жураўлі летнімі раніцамі на Арынавы пшанічны палетак, папас рабіць, пшаніцай маладой наліваючайся ласавацца.

Двох па бакох, шыі выцягнуўшы ды адну нагу падкурчыўшы, на варце стаяць, а рэшта каласы цярэбіць.

Зрабіў Арын некалькі начовак - самаго ну выгнаў; у начоўкі зерня пшаніцы насыпаў, ды першаком заліў, а калі пшаніца добра ў першаку набрыняла, увечары ў поле вынес ды на палеткі

пшанічныя раставіў.
Прыляцелі журавы, бачаць - ляжыць зерне-пшанічкае, буйнае, залацістае. Кінуліся журавы на пшаніцу. Хватаюць поўнымі дзюбамі, зерном мяккім, з дзіўным пахам раскашуюцца.
А калі ўжо добра пад'елі, выскачыў з хмызьнякоў недалёкіх Арын з шнурамі, ды да журавоў.
А яны бедныя і ляцець ня могуць. Крылы падымуць, а галаву пяршак Арынаў - у якім пшаніца мочаная была - дадолу цягне.
І палавіў п'яных жураўоў Арын, як звычлы курэй дзе ў хляўушку. Нарабіў ён пастаронкаў ценкіх з канапель, ды шлеяў на жураўіныя шыі, пастронкі да калыскі лазовай прывязаў, лейцы да дзюбы галоўнаму жураву прыстрочыў.
Дзернуў лейцамі, і паляцеў журавіны ключ з сямёх жураўоў, калыску з Арынам нясучы.
Накіраваў у сваёй адвазе Арын жураўоў уўгору на Сонца Вялікае. Гардыня сэрца Арынавае расьпірае.
Абурылася сьвятое Сонейка на такую нахабнасьць Арынаву, бачачы думкі ягоныя няслыханыя, бунтарныя.
Сяканула яно сваімі праменьнямі гострымі, абярнулася тварам разгневаным у Арынавы вочы, і асьлеп, які хацеў з самым Сонцам сябравацца, як роўны з роўным.
Асьлеп пакараны сонейкам Арын, а разам з ім і ягоныя журавы, і пападалі яны назад на сыру зямліцу, аб камені не прыдарожнае разьбіваючыся.

Але ўпарты быў дух Арына, не сумірыўся ён у сваіх імкненьнях у верхавіны нябесныя сонечныя.
Прарос ён на зямлі кветкаю жоўтаю стрымбуляватаю, якая ўгару ўсьцяж да сонца цягнецца Арнікам залатым.
І ўсьцяж да сонца ён пнецца непакорліва.

ЗАПОМНЕНАЕ СЛОВА
/лягенда/

І каб зьнішчыць усё жывое на зямлі створанае Богам, перавярнуў на зямлю Чорнабог акіян і счынілася паводка вялікая.
А першы чалавек Адам і Іўка, жонка ягоная,- што з вярбіны-івіны па ягонай просьбе створаная Багамі - на дрэва найвышэйшае ўзьлезьлі і Бога малілі, каб ратунак паслаў.
Пачула тады Майя - Богава жонка людзкія маленьні перакінула з вырою маоток - вясёлку рознакалёрную да дзерава і перайшлі людзі з паваротам у вырай.
Але сумна было ў выраю чалавеку і жонцы ягонай. Работы ніякае. А да таго ані пасварыся, ані пакалаціся, ані люльку выкуры.
А жонцы зноў не падабалася, што ўбірацца, прыхарошвацца ня можна. Паплятка - рыць хоць-бы з бярозкаю, што за хатаю расла.
І пачалі людзі худзець у выраю. З кута ў кут ходзяць і месца сабе не знаходзяць...
Пусьцілі іх у пусьці з паваротам на зямлю. Ня можам тут вытрываць. За надта ўжо добра, ды па панску. Усяго бойся.
І таго не рабі і таго. Тое грашно, тое ня можна. Лепей ужо на зямлю. Хоць цяжка, а сам сабе пан. Прычапіліся да Бога - неадчэпяцца.
- Ну, - кажа Бог, - пушчу, але памятай-

це. Не наракайце потым.
Узрадаваліся Адам з Іўкаю. А Багавіца Рада на дарогу - людзей шкадуючы -раду дала:
- Як - кажа - вельмі цяжка на зямлі вам прыйдзецца, дык вось табе Іўка, слова запаветнае. Як убачыш жураваў ключ, што ў вырай лятуць, дык зараз адвярні да гары дном найбліжэйшы камень і слова гэтае прамоў. І спусьцяцца журавы на зямлю і забяруць цябе разам з мужыком з паваротам у вырай і будзеце жыць тут бяз клопату і Бога славіць.
Сабраліся людзі і паехалі на зямлю.
Цягнула зямля, як у выраю сядзелі на усім гатовым, нічога ня робячы.
Але горай было, як прышлося самым дзярно драць, жыта сеяць, лясы карчаваць. Зімой ад сьцюжы касьцянець.
Пачаліся сваркі паміж Адамам і Іўкаю, нараканьні, абвінавачваньні...
І захацелася людзям у прыгожы вырай вярнуцца...
І толькі захацелася ім, а тут у небе трубы нібы медзяныя зазьвінелі - ключы пасланцоў боскіх - жураваў з выраю паказаліся.
І спомніла Іўка, як яе вучыла Багавіца Рада - дый да мужыка:
- Хутчэй, хутчэй камень перавярні. Замкні жураваў дарогу. - А я слова запаветнае скажу і апусьцяцца яны перад намі і палецімо з імі ў вырай, на жыцьцё шчасьлівае, жыцьцё прывольнае.
Перавярнуў Адам камень. Заміту сіліся ўгары журавы, закруціліся над іх

галавамі, каменем на шляху сваім замкнутыя.
А Іўка слова Боскае, запаветнае сказаць хоча. Але запомніла Іўка боскае слова.
Сіліцца, сіліцца - прыпамінае - звонаць у гары журавы...
- Дарэмна.
Ня ўспомніць людзям яго ніколі. Не вярнуцца ў вырай.
І так з году ў год, з века ў век, як пачуюць людзі медзяныя зыкі журавіных ключоў, камень перакідаюць, шлях замыкаючы жураўіны...
Закруцяцца журавы над галовамі...
Але ня ўспомніць чалавек слова запаветнае. - -

КУПАЛА

Сёньня Купала, заўтра Ян
сьвятое сонейка сьвяці нам
Гой Купала, Купала.

Лунаюць словы Малітвы-Замовы стара-ветнае з Крывіцкай зямлі ў неба.
Высыпалі людзі на берагі рэкаў, руча-еў... На ўзгоркі высокія.
Вярніся сонца краснае. Сонейка сьвятое жыцьцядайнае. Разьбі сталёвыя ланцугі злых моцаў у якія Цябе падступна закуў на дне рэчным люты Яшчар - водны ўладар.
Во згінем мы без Цябе. Твае дзеці з Зямлі Крывіцкае.
Без сьвятла Тваго. Без цяпла Тваго. Без Цябе, што ў дзень праменьнямі, а ў начы полымем Гоуда, нашы сэрцы, нашыя душы разьвясельвала.
І гавораць словы сівое лягенды:
... І калі агледзеліся людзі, што пакінуў хаты Багач-Ярыла, зманены на дно марское Яшчарам. Заплакалі, завойкалі моцна і Рады-багіні дапамогі запрасілі, каб ад злога Яшчара Ярылу-цяпла - дайнага вызваліць.
...І навучыла Рада людзей ключ зрабіць каб Ярылу-агонь з дна марскога вызваліць - адамкнуць - на зямлю, у хаты вярнуць.
...І ўзялі людзі жэрдку. Пры канцох дзьве папярэчкі для рук прымацавалі.
Да дзерава сухога падыйшлі і з маліт-

ваю церці па ім зробленай прыкладай па чалі.
І тады адамкнулася дно марское, трэснулі путы злое моцы і вярнуўся Ярыла, агнём вясёлым з паваротам на зямлю.
...І калі адыходзіў Ярыла-бог на неба, людзям свой ключ цудоўны пакінуў-крыж шасьцікутны, якім кажную міць на помач Ярылу - агнём з неба паклікаць можна.
І не растаюцца з тае пары Крывічы з дарункам боскім - "Ярылавым крыжом" яго завучы.
А Ярылу па павароце з нетраў морскіх назваў народ "Купалай", бо ў вадзе купаўся.
Стольні лягенда.
І трэба ў той дзень усім людзям купацца, каб моц Ярылаву атрымаць, моцы цёмныя перамагчы, як Ён перамог.
Цераз агонь скакаць грудоў Купальскіх, які ўсе гэтыя чорныя моцы, што чала вэка трымаюць - зьнішчыць.
Запалаюць агні ў начы на берагох рэкаў, на ўзгорках высокіх.
Пакоціцца ў цемру начную вогненае кола, у памяць адыходу Ярылы, пушчанае з гары.
Па рацэ вянкі варажобныя з сьвятым Купальскім агнём паплывуць, долю маладым дзяўчатам і хлапцом вяшчуючы.
У пары хадзіць. Адной у самоце. Ці яснай сьвечкай згаснуць, у зямлю, у чорнае царства пайсьці.
А ў лесе зацьвіце цудоўным боскім агнём кветка-папарацьь, даючая ўласьніку яе, усіх лятуценьняў, мрояў пажаданьдзяў

урачаісьненьне.
Шчасьце, Любоу, Багацтва.
І пойдуць людзі на Крывіцкай Зямлі і
у гэтым годзе шукаць гэтую кветку цу
доуную...
Як тысячы год ходзяць.
Мо і ня зусім так. Не за рукі узяушы
ся... парамі...
А дзесяткамі, соткамі. --
Не з вянкамі зялёнымі у руках, вара-
жобнымі - а з ручыцамі воласам плюю
чымі супраць моцау горных, што даро-
гі, шляхі да Цуда-кветкі перагарадзі-
лі.
І не запалаюць на узгорках Радзімы
агні купальскія з вецьця сухога.
Пальмнуць у неба начнае яны хатау
стрэхамі, палацау стагодніх віхурай
агнёваю... І
Далёкім на небе начным сполахам - за-
рывам крывавым.
Каб чуу люты Янчар, што жыу Ярыла.
Што яшчэ ня умерлі ягоныя сыны.
Што будзе яшчэ сьвяціць нам сьвятое
сонейка.
Хоць цяпер закутае, забранае моцамі
праклятымі.
Што здабудзе яшчэ Крывіцкі Род сваю
кветку шчасьця. Кветку мрояу тысячага
довых, патаемных.

Сяньня Купала, заутра Ян.
Сьвятое сонейка судзі нам.
Гой Купала.
Купала.

ЯК НА СЬВЕЦЕ ПАНЫ ПАУСТАЛІ
/Лягенда з Палесься/

І стварыў Бог усю жывёлу зямную, і рака малога і слана аграмадзіну і кіта у моры-акіяне і ментуза праныру і гадаў асьлізлых і птушак лёгкакрылых.
А тады пастанавіў яшчэ чалавека стварыць, каб над жывёлаю зямною панаваньне меў.
А каб розьніўся чалавек, які панам над жывёлаю меў быць, ад падначальных своіх, пастанавіў Пан-Бог чалавека не з зямлі, а з цеста пшанічнага выляпіць, каб цела далікатнае гаспадар зямлі меў, думкі узьнеслыя, помыслы пышныя.
А было гэта вечарам шостага дня тварэньня зямнога.
Узяў Бог мукі пшанічнай з каморы мех поўны. У хату заволок. У дзяжу высыпаў, вадой разьвёў і мясіць пачаў.

Ну і тут нешта прышлося Пану-Богу за патрэбай з хаты выйсьці, а дзьверы праз запамненьне адчыненымі пакінуў.
А сабака, як той сабака на панадворку каля хаты круціўся, а да таго і галодны быў.
Вось бачыць дзьверы адчыненыя, а з хаты нечым смачным нясе. Ну і пацягнула яго нялёгкае ў хату.
А тут дзяжа з цестам пшанічным. Галоднаму сабацы і сьлінкі ад гэтакага цуду пацяклі.
Аглянуўся - няма Бога-гаспадара. Скочыў да дзяжы сабака. Лапу-цапу. Лапу-

цапу. Не агглядзеўся ажно і дно ў дзя-жы відаць!
Уваходзіць Бог. А ліхачкі! Усё цеста пёс сажлопаў!
Як не вазьмё Пана Бога злосьць. Як ня хопіць з кута кацярэжку! Як ня грымне па сабацы!
А сабака з перапалоху - у ногі. А Бог за ім, ды качарэжкай! Ды качарэжкай!
А ў таго з перапуду мядзьвежая хвароба трапілася - бяжыць ды цеста аддаё...
Вось з гэтага цеста і паўсталі паны нашыя.
Бо іншае мукі ўжо на складзе ў Бога ня было, усю сабака сажлопаў, а з зямлі як простага чалавека ня выпадала шлях ту рабіць.
І вось дзе ў бегу прытуліўся сабака да бярозы - паны Бяразоўскія паўста-лі. А да дуба - Дубоўскія, да граба - Грабоўскія, да сасонкі - Сасноўскія...
Ведаюць і паны самы скуль яны паўс-талі, бо як толькі ў злосьці так адзін аднаго пачынаюць частаваць ад сабачай пароды:
Псякрэў і псякрэў!
Дык вось павярнуў Бог да дому, а тут ужо і сонка яснаё зусім заходзіць пача ло - вечарэць, сутунець на зямлі нова-створанай.
А тут гэтакую штуку сабака ўцяў! Хацеў было Бог пасьля паноў, чалавека прос-тага з жытняе мукі выляпіць, але за гэтай багатнёй і панскім тварэньнем і часу нястала.
Аглянўўся туды-сюды, бачыць Бог ля-жыць гліна, што на печ сабе прывёз анегдай.

Заоучыў Тварыцель рукавы, руды жоўтай з крыніц балотных чарпануў і працу распачаў.
Выляпіў людзіну па ўзору свайму, дух у сярэдзіну удунуў. І у іглу нітку зацягнуўшы, вузёл заомаргнуў і трыбух зашыў, не шкадуючы ніткі, абарваўшы канец пакінуў і за зашываньне жанчыны ўзяўся, ды позна агладзіўся, што на жанчыну нітак ня хопіць, дык ужо і вузла не заморгваў, цягнуў, цягнуў, а такі... Ніткі не хапіла, гэтак і засталося. Таму і відаць вузёл ад ніткі толькі ў мужчыны ў гарлянцы, а ў жанчыны няма. Але усё якось добра выйшла і жывуць людзі на сьвеце да гэтае пары і Бога Стварца славяць. Толькі з панамі ня ў суладзе. Бо тыя з пшанічнага цеста, а мы з гліны.

- - - - - - -